УДК 821.161.3

В.У.Гараева, навучэнка
Н.М.Мяркулава, навуковы кіраўнік, выкладчык
(філіял БДТУ «Бабруйскі дзяржаўны лесатэхнічны каледж»)

# ТЭКСТЫ СУЧАСНЫХ ПЕСЕНЬ: ПАЭЗІЯ І АНТЫПАЭЗІЯ

У нашы дні ўсё часцей з экранаў тэлевізараў, з інтэрнэт-сайтаў даносяцца песні, пазбаўленыя ўсякага зместу. Сучасныя «сачыніцелі» выкарыстоўваюць словы і выразы, якія не маюць ніякага сэнсавага зместу. У сучаснага чалавека ёсць выбар: слухаць бессэнсоўныя фразы сучасных рок і пап-выканаўцаў, якія шмат разоў паўтараюцца, – М.Надзёнаў, С.Міхалок – ці звярнуцца да песень, напрыклад, Уладзіміра Карызны. Апошняга, на маю думку, варта аднесці да сапраўднай паэзіі, а першых – да антыпаэзіі. Чаму ж побач з цудоўнымі вершамі і песнямі нараджаюцца песні – аднадзёнкі? Каму яны цікавы?

Спачатку трэба ўспомніць, што такое лірыка. Лірыка – адзін з трох родаў літаратуры, які адлюстроўвае рэчаіснасць праз вобраз-перажыванне. Аб’ектам адлюстравання ў лірыцы з’яўляецца ўнутраны свет чалавека, яго духоўнае жыццё, пачуцці, перажыванні, думкі. Слова лірыка часта выкарыстоўваецца як сінонім паэзіі.

Перш чым пачаць сваё даследаванне тэкстаў сучасных беларускіх песень, азнаёмілася з навуковымі работамі па дадзенай тэме ў рускай1 літаратуры.

У якасці прыкладу для правядзення свайго даследавання выкарыстала навуковую работу С.С.Маркевіч «Тексты современных песен: поэзия или антипоэзия?», знойдзеную ў Інтэрнэце.[1] Аўтар работы для свайго даследавання ўзяла тэксты сучасных песень на рускай мове. Маркевіч С.С. піша аб тым, што самымі распаўсюджанымі тэмамі сучасных песень з’яўляюцца дзве: каханне і час. У тэкстах песень пра каханне эмацыянальны пачатак перадаецца пры дапамозе слоў-сігналаў, вынікам чаго з’яўляецца эмацыянальная беднасць вывучаемых тэкстаў, а таксама іх стандартнасць.

Паэзія – (у перакладзе з грэчаскай мовы абазначае «творчасць») – асобы сродак арганізацыі маўлення; славесная мастацкая творчасць, пераважна вершаваная.

Многія людзі, якія маюць адносіны да паэзіі, задумваліся аб гэтым слове, але для нас яно звычайна асацыіруецца з чымсьці светлым у жыцці. «Паэзіі без шчырасці, адкрытасці, нават у чымсьці наіўнасці

не можа быць. Усё геніяльнае – простае і ў той жа час глыбокае, як сама прырода... Сапраўдны паэт спасцігае гэтую глыбіню, перадае словамі сутнасць прыроды... Калі піша вершы, ён усяго сябе раскрывае людзям, як самым блізкім сваім сябрам. Таму што, калі ён так не раскажа, то слухаць не будуць, чытаць не будуць...» – гэтыя словы належаць беларускаму паэту-песеннеку Уладзіміру Карызне.

Прыемнае гучанне для слыху, мілагучнасць надае вершу рыфма. «Рыфма – сігнальныя званочкі», – пісала Г.Ахматава. Рыфма ўстанаўлівае сувязь паміж словамі, якія гучаць падобна, і прымушае нас прызнаваць блізкасць і роднасць прадметаў, абазначаных гэтымі словамі. Такім чынам, нанова дасягаецца сутнасць з’яў. Таму важна, як рыфмаваць. Акрамя таго, канец радка, рыфма – гэта сэнсавы акцэнт. Аднак рыфма не абавязковая адзнака верша. Калі мы звернемся да сеткавай паэзіі, якая не мае рэдактара, то можам убачыць змяшэнне розных прынцыпаў вершаскладання, як вынік аматарскіх адносін да вершатворчасці.

Таксама як матэрыя і антыматэрыя, мы можам устанавіць, што ёсць нешта, супрацьлеглае Паэзіі. Паэзія сумуе, калі дрэнна, радуецца, калі ўсё добра. Антыпаэзія ўзмацняе дрэннае, радуецца, калі бачыць дрэннае, робіць так, каб негатыўнага было больш.

Антыпаэзія па фармальных прыкметах не адрозніваецца ад паэзіі, але ўнутрана змест супярэчыць эстэтычным прынцыпам, змешчаных у паняцці «паэзія».

Што ж мы можам аднесці да Антыпаэзіі? Ёсць так званая «падзаборная» паэзія – з выкарыстаннем нецэнзурнай лексікі. Але паэт – высокакультурны і адукаваны чалавек, які можа знайсці эпітэты, зразумелыя любому чалавеку, і абысціся без лаянкі. Ёсць літаратары – аматары, якія лічаць сябе абавязанымі ўносіць у вершы брыдкасці, адстойваць свае думкі, што паэзія прызначана апяваць усялякую брыдоту. Такія творы нельга аднесці да паэзіі. Але Антыпаэзіія ў сучасным свеце лёгка маскіруецца пад Паэзію, сцвярджаючы свае прынцыпы ад імя Паэзіі. Закончу цытатай: “Мастацтву заўсёды пагражалі два страшыдлы – мастак, які не стаў майстарам, і майстар, які не з’яўляецца мастаком” (Б.Прус) Таксама, як мора змывае з сябе смецце і пену, выкідваючы іх з сваіх магутных плеч на бераг, так і Паэзія ачышчае сябе, выкідваючы Антыпаэзію на задворкі літаратуры.

Даследуючы навуковую літаратуру па дадзенай тэме, вывучыўшы вопыт аналізу паэзіі сучасных песень, вырашыла правесці ўласны навуковы эксперымент. Для работы былі выбраны дзесяць сучасных найбольш папулярных беларускіх выканаўцаў – «J-МОРС» песня «Паветра»; Паліна Паланейчык песня «Апошнія спробы»; дуэт

«NAVI BAND» песня «Хуткімі думкамі»; рок-гурт «Крамбамбуля» песня «Старыя хіпаны»; рок-гурт «Ляпіс Трубяцкі» песня «Сонейка»; Вольга Сацюк «Абяцаю»; дуэт «UZARI» песня «Размовы»; Ганна Шаркунова песня «Мы будзем першымі»; ЗЕНА песня «Чыстая як сляза»; рок-гурт «МРОЯ» песня «Ноч за акном» - падабрала вядомыя тэксты песень на беларускай мове. Спынілася на больш распаўсюджаных стылях у музыцы: рок-музыка, пап-музыка. Не стала выпраўляць арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі. Пакінута ўсё так, як было на сайтах Інтэрнэта. Дарэчы сказаць, што амаль усе выканаўцы выбраных мною песень з'яўляюцца аўтарамі тэкстаў.

У тэксце кожнай песні паспрабавала вызначыць тэму, асноўную думку, вызначыць асноўны змест, знайсці выкарыстаныя выяўленча-мастацкія прыёмы, паназіраць за пабудовай верша. Таксама быў складзены спіс песень у адпаведнасці з тым, наколькі іх тэксты адносяцца не да паэзіі, а да антыпаэзіі: 10 месца – гэта лепшая з 10 песень, 1 месца – горшая.

Пасля праведзенага аналізу тэкстаў песень, зрабіла вывад: тэксты песень у большасці пра каханне (з 10 – 6 пра каханне, 1 – пра родны край, 2 – пра жыццё, 1 – адзіноцтва); выклікае пэўную цяжкасць вызначыць дакладную тэму тэкстаў, асноўную думку і сэнс; недастатковае выкарыстанне мастацкіх прыёмаў, у тэкстах аўтары выкарыстоўваюць прыблізную рыфму. Такім чынам, выдвінутая гіпотэза пацвердзілася: у сучасных песнях вядомых беларускіх выканаўцаў на беларускай мове сапраўды больш антыпаэзіі, чым паэзіі.

Для таго каб выявіць адносіны да паэзіі і да антыпаэзіі, да і ўвогуле, сучаснай беларускай музыцы, было праведзена анкетаванне сярод аднагрупнікаў і выкладчыкаў. Ім была прапанавана анкета.

У анкету былі ўключаны такія пытанні:

- Што такое паэзія?
- Што такое антыпаэзія?
- Ці любіце вы слухаць музыку і калі "да" , то якую?
- Як вы лічаце, ці ёсць сэнс у тэкстах сучасных песень?
- Як вы думаеце, ці будуць выконвацца песні нашага часу праз 10-20 гадоў?
- Ці можаце вы прывесці прыклады песень, якія вытрымаюць выпрабаванне часам?

У анкетаванні прынялі ўдзел навучэнцы групы ПО 4 (25 чалавек) і выкладчыкі каледжа (5 чалавек).

Анкету прапанавалі навучэнцам груп МД-21, ТД 20 і ЛХ 12. Пасля таго, як яны праслухалі ўсе 10 песень і на слых азнаёміліся з тэкстамі, яны павінны былі выбраць твор, які (на іх думку) можна

аднесці да паэзіі, а які да антыпаэзіі.

Пасля аналізу анкет былі зроблены вывады, што усе ўдзельнікі выразна разумеюць розніцу паміж двума паняццямі: паэзія і антыпаэзія (паэзія – гэта нешта прыгожае, антыпаэзія – скажоная форма паэзіі). Таксама ўсе рэспандэнты любяць слухаць музыку, перавагу аддаюць пап-музыцы. На жаль, мала хто ведае старыя беларускія песні, слухае і цікавіцца сучаснай беларускай эстрадай.

52% апытаных лічаць, што сэнсу ў сучасных песнях няма зусім. 32% – ёсць, толькі не ва ўсіх. 16% лічаць, што сэнсу няма і ён не абавязковы, была б толькі цудоўная музыка. Палова ўдзельнікаў анкетавання лічаць, што сучасныя песні пройдуць выпрабаванне часам.

Навучэнцы першага курса групы МД 21 лічаць што да паэзіі можна аднесці песню «Чыстая, як сляза» ў выкананні ЗЕНА; да антыпаэзіі – песню «Абяцаю» ў выкананні Вольгі Сацюк.

Навучэнцы другога курса групы ТД 20 да паэзіі аднеслі песню «Размовы» ў выкананні гурта «UZARI»; да антыпаэзіі – песню «Ноч за акном» у выкананні гурта «МРОЯ».

Навучэнцы чацвёртага курса групы ЛХ 12 таксама да паэзіі аднеслі песню «Размовы» ў выкананні гурта «UZARI»; да антыпаэзіі – песню «Абяцаю» у выкананні Вольгі Сацюк.

Калі ў сваім даследаванні тэкстаў песень больш кіравалася мастацкім афармленнем тэксту, то на выбар навучэнцаў больш уплывала музыка, напісаная да гэтых тэкстаў.

На прыканцы хачу сказаць: песня павінна дапамагаць людзям быць людзьмі, а не разбэшчваць іх. Няўжо гэтая “папса” можа нам сказаць штосьці пра жыццё, пра святое? Не, яна толькі забруджвае нашы душы. Музыку і песенныя тэксты могуць пісаць толькі адзінкі, абраныя лёсам людзі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Маркевич, С.С., Тексты современных песен – поэзия или антипоэзия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.proshkolu.ru. – Дата доступа: 15.11.2020.